Нацыянальны інстытут адукацыі

**Кампетэнтнасны падыход**

Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. М. Якуба

# Беларуская мова

# 10 клас

## Дыдактычныя і дыягнастычныя матэрыялы

(базавы і павышаны ўзроўні)

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

М а з ы р
«Выснова»
2 0 2 1

# Базавы ўзровень

## РОЛЯ МОВЫ Ў ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДСТВА

➲ **Прачытайце тэкст. З якой мэтай выкарыстоўваецца «ясная мова»?**

**«Ясная мова»**

У кожнага з нас ёсць праблемы, але, калі чалавек мае інваліднасць, колькасць і вастрыня праблем істотна павялічваюцца. І аднаму справіцца з імі часта не пад сілу. Задача дзяржавы і грамадства — прыйсці на дапамогу, каб зрабіць жыццё чалавека з інваліднасцю больш камфортным і якасным.

Як і любы чалавек, людзі з разумовымі абмежаваннямі маюць права на атрыманне зразумелай інфармацыі. Але як данесці яе да тых, хто адчувае цяжкасці з чытаннем і пісьмом?

Наша краіна ратыфікавала Канвенцыю ААН аб правах інвалідаў, адзін з раздзелаў якой прысвечаны неабходнасці ўкаранення «яснай мовы» як даступнага сродку камунікацыі для людзей з разумовымі абмежаваннямі.

Праект «Доступ да інфармацыі для людзей з інваліднасцю, або “Ясная мова”» накіраваны на стварэнне безбар'ернага камунікатыўнага асяроддзя для людзей з разумовымі абмежаваннямі. У «яснай мове» скарочаны слоўнік, спрошчана структура выказванняў, тэкст пішацца і размяшчаецца па пэўных правілах. На ёй нельга напісаць, напрыклад, «аўтатранспартны сродак для перавозкі пасажыраў», замест гэтага — «аўтобус». Таксама выкарыстоўваюцца карцінкі, якія называюцца піктаграмамі.

«Ясная мова» патрэбна і для людзей сталага ўзросту, якія адчуваюць складанасці з засваеннем інфармацыі. Яна важная і для замежнікаў: дзякуючы ёй лёгка зразумець, напрыклад, меню ў кавярні, якое на «яснай мове» выглядае вельмі проста — малюнкі і цана. Гэта датычыцца і інфармацыі ў аэрапортах, на вакзалах, у крамах. Так што інфармацыяй, даступна пададзенай для людзей з інтэлектуальнымі парушэннямі, могуць карыстацца і іншыя *(Паводле С. Бусько).*

- Як вы разумееце выраз «безбар'ернае камунікатыўнае асяроддзе»?
- У якой частцы тэксту паведамляецца пра асаблівасці «яснай мовы»?
- Каму можа быць патрэбнай і карыснай інфармацыя, пададзеная на «яснай мове»?
- Падрыхтуйце вуснае выказванне пра тое, як можна зрабіць жыццё чалавека з інваліднасцю больш камфортным і якасным (тып тэксту — разважанне).
- Падбярыце сінонімы да слова *ратыфікаваць*.
- Знайдзіце ў тэксце слова, якому адпавядае наступная даведка аб паходжанні: ад лацінскага *pictus* 'маляўнічы' і грэчаскага *gramma* 'запіс'. Раскрыйце значэнне гэтага слова.
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў першым сказе.

## МАЎЛЕННЕ

➲ **Прачытайце некаторыя патрабаванні да стварэння і адаптацыі тэкстаў на «яснай мове».**

Тексты, которые разрабатываются на «ясном языке», должны отвечать ряду требований.

Избегайте длинных и сложных для понимания слов.

Используйте часто употребляемые слова.

Избегайте сокращения слов и аббревиатур.

Используйте одни и те же слова для обозначения одних и тех же явлений, объектов, действий, ситуаций.

Избегайте использования частицы *не*.

Избегайте по возможности использования сложных для понимания терминов и иностранных слов. Если нет возможности заменить сложные для понимания термины и слова, пишите пояснения к ним непосредственно в тексте.

Избегайте использования сносок для разъяснения значения слов.

Пишите слова без переноса с одной строки на другую.

Используйте короткие предложения.

Начинайте каждое предложение с новой строки.

Стройте предложение так, чтобы в нем передавалась одна мысль.

Разделяйте длинные предложения на несколько коротких.

По возможности используйте предложения с одним подлежащим.

- Якія з прыведзеных патрабаванняў могуць быць рэалізаваны толькі ў пісьмовым маўленні?
- На аснове прыведзенай інфармацыі запоўніце на беларускай мове табліцу:

| **Тэксты на «яснай мове»** | | | |
|---|---|---|---|
| **Патрабаванні да слоў** | | **Патрабаванні да сказаў** | |
| Рэкамендуецца выкарыстоўваць | Варта пазбягаць | Рэкамендуецца выкарыстоўваць | Варта пазбягаць |
| | | | |

- Дакажыце, што прыведзеныя патрабаванні дазваляюць пры захаванні асноўнага зместу тэксту зрабіць яго даступным для любога чытача.
- Прывядзіце прыклады сітуацый маўлення, у якіх могуць выкарыстоўвацца тэксты на «яснай мове».

➲ **Прачытайце тэксты. Якія з іх складзены з улікам патрабаванняў «яснай мовы»?**

**I.** Нас з вамі чакае знаёмства з унікальным будынкам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) — галоўнай бібліятэкі нашай краіны. У ходзе экскурсіі мы прагуляемся па некалькіх паверхах (па першым і па другім), а таксама на ліфце паднімемся на дах будынка, дзе знаходзіцца назіральная пляцоўка.

**II.** Сёння мы пазнаёмімся з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі — гэта галоўная бібліятэка нашай краіны.

Мы пройдзем па першым і другім паверхах бібліятэкі.

На ліфце мы паднімемся на дах бібліятэкі.

На даху знаходзіцца назіральная пляцоўка.

Назіральная пляцоўка — гэта месца, з якога мы ўбачым горад.

- Якія патрабаванні ўлічаны пры адаптацыі тэксту на «яснай мове»?
- Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце, складзеным з улікам патрабаванняў «яснай мовы».

## ТЭКСТ

➲ **Пазнаёмцеся з парадкам запісу ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі.**

Для запісу ў бібліятэку і атрымання чытацкага білета наведвальніку неабходна прад'явіць дакумент, які пацвярджае асобу: пашпарт, від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пасведчанне бежанца.

Чытацкі білет выдаецца пасля аплаты. У выпадку страты і пашкоджання чытацкага білета выдаецца яго дублікат. Калі чытач забыў чытацкі білет, яму бясплатна выдаецца часовы чытацкі білет, але не больш за пяць разоў за год.

- Паспрабуйце адаптаваць тэкст з улікам патрабаванняў «яснай мовы». Запішыце адаптаваны тэкст.

➲ **Пісьмова перакладзіце тэкст на беларускую мову.**

**День огурца**

Современная достопримечательность Шклова — памятник огурцу, установленный в 2007 году перед Домом культуры, напротив рынка. Памятник, созданный могилёвским скульптором Андреем Воробьёвым, стал символом города: Шкловщина издавна славилась выращиванием огурцов и их богатыми урожаями.



Весит бронзовый огурец 300 килограммов. Это весёлый мужичок в пиджаке и галстуке-бабочке. На голове у него шапка из листочка, в одной руке — корзина с огурцами, в другой — цветок огурца.

С 2006 года в Шклове устраивают свой праздник — День огурца. И теперь всем благодаря празднику известно, что в Шклове растут самые вкусные и хрустящие огурцы *(По Т. Жуковской)*.

Слоўнік:

*достопримечательность* — выдатная мясціна, славутасць
*галстук-бабочка* — гальштук-бабачка
*устраивать праздник* — наладжваць свята
*хрустящий* — хру́сткі, храбусткі́

- Чаму помнік агурку стаў сімвалам Шклова?
- Знайдзіце ў тэксце апісанне помніка. Ці адпавядае яно выяве на фотаздымку? Вусна дапоўніце апісанне інфармацыяй пра настрой, які выклікае помнік агурку.
- Уявіце, што вы праводзіце экскурсію па Шклове. Што б вы паведамілі гасцям горада, спыніўшыся каля помніка агурку?
- Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы.

• Знайдзіце ў тэксце прыклады сказаў, звязаных паміж сабой пры дапамозе займеннікаў, злучнікаў, лексічных паўтораў.

## КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

➲ **Пазнаёмцеся з правіламі паводзін слухача. Дакажыце, што яны спрыяюць наладжванню неканфліктных, добразычлівых узаемаадносін.**

Падчас размовы паводзіны слухача, яго адносіны да суразмоўцы фарміруюць у таго думку пра асобу слухача. Таму пры размове неабходна прытрымлівацца пэўных правіл.

Пры звароце каго-небудзь да вас неабходна спыніць справы і ўважліва выслухаць таго, хто гаворыць. Пры адсутнасці часу на размову трэба тактоўна растлумачыць прычыну сваёй занятасці і прапанаваць перанесці гутарку на іншы час.

У час размовы трэба быць цярплівым, ставіцца да суразмоўцы добразычліва, слухаць яго ўважліва, не спяшацца пярэчыць і спрачацца, не выслухаўшы да канца. Толькі дрэнна выхаваны, некультурны чалавек можа папраўляць апавядальніка, адварочвацца ад яго, паглядаць на гадзіннік, пазяхаць, паралельна ўступаць у размову з іншым чалавекам.

Непажадана перапыняць суразмоўцу. Наадварот, варта пацвярджаць сваю зацікаўленасць размовай, выкарыстоўваючы для гэтага моўныя (так-так, вось-вось, але) і нямоўныя (позірк у вочы, кіўкі галавы, міміка) сродкі.

Не варта марудзіць з адказам, калі суразмоўца звярнуўся да вас з пытаннем. Трэба ўмела спалучаць уменні слухаць і гаварыць, не замяняючы, аднак, слуханне гаварэннем. Беларуская прыказка вучыць: *Спачатку будзь выслуха́чым, а потым апавяда́чым*.

Мэтазгодна задаваць суразмоўцу пытанні — гэта дазволіць яму больш поўна выказаць свае думкі і пачуцці, пакажа вашу зацікаўленасць у размове і зробіць гутарку

больш змястоўнай. Аднак для падтрымання размовы не варта задаваць пытанні анкетнага характару: яны могуць насцярожыць суразмоўцу, выклікаць уражанне размовы са следчым.

*Пры размове нельга рабіць іранічныя заўвагі, таму што гэта можа збіць суразмоўцу з думкі і выклікаць негатыўную рэакцыю ў адносінах да слухача.*

Пры ўдзеле ў размове некалькіх чалавек не трэба адказваць на пытанне, звернутае да іншага суразмоўцы. Адказаць за другога чалавека можна толькі тады, калі той не рэагуе на пытанне. Аднак прамаўчаць у адказ на пытанне — значыць не толькі парушыць правілы культуры зносін, але і паказаць сябе неразумным або ганарлівым чалавекам *(Паводле А. Солахава).*

- Растлумачце сэнс ужытай у тэксце прыказкі.
- Якімі правіламі паводзін слухача вы дапоўнілі б гэты тэкст?
- Запішыце тыя правілы паводзін слухача, якія, на вашу думку, з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі, сцісла сфармуляваўшы іх у форме пабуджальных сказаў. У якой форме ўжыты дзеясловы ў складзеных вамі пабуджальных сказах?
- Перабудуйце выдзелены складаназалежны сказ у бяззлучнікавы складаны сказ. Пракаменціруйце яго пунктуацыйнае афармленне.

➲ **Прачытайце тэкст. Пра якія якасці культуры маўлення разважае аўтар?**

Академик Лев Владимирович Щерба говорил: «Правила существуют для того, чтобы их с умом можно было нарушать». Форма этого высказывания парадоксальна, но мысль верна и глубока. Если существует строгая норма — например, орфографическая, если она неуклонно выполняется, то продуманные и обоснованные отступления от неё сразу будут замечены и по достоинству оценены читателем (как

# Змест

**ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**Базавы ўзровень**

РОЛЯ МОВЫ Ў ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДСТВА . . . 14
МАЎЛЕННЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
ТЭКСТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
АРФАЭПІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
АКЦЭНТАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
АРФАГРАФІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
ЛЕКСІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
ФРАЗЕАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . 41
МАРФАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
ПАЎТАРЭННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА . . . . 49

**Павышаны ўзровень**

ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ. ГРАФІКА І АРФАГРАФІЯ. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ . . . . . 57
МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ І АРФАГРАФІЯ. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ . . . . . . . . . . . . 59
МАРФАЛОГІЯ І АРФАГРАФІЯ. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ . . 61
ПАЎТАРЭННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА . . . . 77

**ДЫЯГНАСТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ** . . . . . . . . . . . . . . . 86

**Базавы ўзровень**

МАЎЛЕННЕ. ТЭКСТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
АРФАЭПІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
АКЦЭНТАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
АРФАГРАФІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
ЛЕКСІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
ФРАЗЕАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . 102
МАРФАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
ПАЎТАРЭННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА . . . . 105